# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ (матэрыялы для аналізу і падрыхтоўкі)

## IX клас

**Заданне 1.** Падбярыце беларускія адпаведнікі да словазлучэнняў з рускім словам «речь». *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| Словазлучэнні на рускай мове | Адпаведнікі словазлучэнняў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) устная *речь* | |
| 2) части *речи* | |
| 3) у него непонятная *речь* | |
| 4) прямая (косвенная) *речь* | |
| 5) завести *речь о...* | |

**Заданне 2.** Падкрэсліце ў кожным радзе слова(ы) з арфаграфічнымі памылкамі. *(Максімальная колькасць балаў — 6.)*

1) Штосьці, карэнчык, нянчыць, паштальён, людзьмі;

2) канцэлярыя, бухгалтар, адрас, арэндавацъ, крывавы;

3) штотыднёвы, вогняўстойлівы, землятрасенне, своечасовы, збожжаўборка.

Заданне 3. Пастаўце дзеясловы ў форме загаднага ладу адзіночнага і множнага ліку. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

**Узор**: спаць — спі, спіце.

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1) браць | | |
| 2) мыць | | |
| 3) звузіць | | |
| 4) зрэзаць | | |

**Заданне 4.** Запішыце лексічныя значэнні слоў, у якіх указаныя назоўнікі маюць канчаткі *-а* і *-у*. *(Максімальная колькасць балаў — 6.)*

**Узор:** бялок — бялк-а (частка яйка), бялк-у (арганічнае рэчыва).

| Назоўнік | Лексічнае значэнне для канчатка *-а* | Лексічнае значэнне для канчатка *-у* |
|---|---|---|
| 1) народ *(-а/-у)* | | |
| 2) пейзаж *(-а/-у)* | | |
| 3) пераход *(-а/-у)* | | |

**Заданне 5.** Для беларускага гутарковага маўлення характэрнай прыметай з'яўляецца замена гука [ф] іншымі гукамі ці спалучэннямі гукаў. Запішыце, як у адпаведнасці з гэтым могуць гучаць размоўныя варыянты жаночых імёнаў *Ефрасіння, Марфа, Софія, Фёкла, Фядосся. (Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| Літаратурная форма жаночага імя | Размоўная форма жаночага імя |
|---|---|
| 1) Е[ф]расіння | |
| 2) Мар[ф]а | |
| 3) Со[ф']ія | |
| 4) [Ф']ядора | |
| 5) [Ф']ядосся | |

**Заданне 6.** Падкрэсліце словы, правільна падзеленыя на марфемы. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

Да-вяр-а-ц-ца, да-дум-ва-ць, да-і-ць, да-кор, дакуль, дакук-а, далё-к-і, дал-і-н-а, дал-онь, дал-оў.

**Заданне 7.** Запоўніце табліцу, аднавіўшы па значэнні прыказкі, крыніцай якіх стала Біблія. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

1) 'Непрыемнасць можа здарыцца з тым, хто жадае ці робіць яе іншым' Часцей ужываецца як 'перасцярога не рабіць благога каму-н'.

2) 'Кажуць, звычайна іранічна, калі каму-н. даводзіцца цярпець пабоі ці іншыя непрыемнасці не ад чужых людзей, а ад сваіх жа'.

3) 'За свае справы, учынкі даводзіцца расплачвацца'

4) 'Пра непазбежнасць раскрыцця таго, што было чыёй-н. тайнай'.

5) 'Ужываецца як перасцярога не гаварыць нічога лішняга'.

| Прыказка |
|---|
| 1) |
| 2) |
| 3) |
| 4) |
| 5) |

**Заданне 8.** Адкажыце на пытанні віктарыны. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

1. З кім развітваецца А. Куляшоў у вершы «Бывай...»?

АДКАЗ: ________________________________

2. Да якой Коласавай літаратурнай казкі эпіграфам узяты словы Янкі Купалы: «Не шукай ты шчасця, долі / На чужым далёкім полі»?

АДКАЗ:________________________________

3. Да якой п'есы А. Дударава падыходзяць словы: «Жыццё — выпрабаванне чалавека на чалавечнасць. І ўвечары павінна свяціць сонца»?

АДКАЗ:________________________________

4. У прадмову да якой кнігі ўвайшлі вядомыя словы Ф. Скарыны: «Понеже от прироження звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птицы, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя... тако же и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають»?

АДКАЗ:________________________________

**Заданне 9.** Каму з пералічаных герояў «Паўлінкі» Янкі Купалы належаць наступныя словы? Суаднясіце прыведзеныя выказванні з адпаведнымі персанажамі. Адказ запішыце ў форме спалучэння «лічба-літара» (напрыклад, 6-е). *(Максімальная колькасць балаў — 7.)*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | «Рукам каля дзяўчыны дае волю без пытання, а як папяроску закурыць, дык пазвалення просіць». | а. Агата |
| 2. | «Так-то яно так! Але я неяк усё яшчэ надзеі не трачу, — ану ж адпусціцца». | б. Адольф |
| 3. | «Ты, каханенькая, родненькая, нічога не разбіраеш... Валасы доўгія, а розум кароткі». | в. Сцяпан |
| 4. | «Кажуць, француз, пане дабрудзею, ідзе на Барысава па шапку і рукавіцы, што калісь там заставіў». | г. Пранцісь |
| 5. | «Сам кабылу, тудэма-сюдэма, паставіў у вас пад паветкай, а шукае за плотам. Дарма толькі поўзалі і слядоў прыглядаліся». | д. Паўлінка |
| 6. | «Вот так на ўсе бакі дзеўка! Адным словам, як сторублёвая кабыла». | е. Якім |
| 7. | «Э-э! Я думала, хто там!.. Ажно нічога людскога. Толькі ездзіць ды нюхае, якая дзяўчына пасагу больш мае, а сам дык голы, як бізун». | ж. Альжбета |

АДКАЗ: ____________________

**Заданне 10.** Вызначце вершаваны памер прыведзеных ніжэй радкоў. Назавіце аўтара і літаратурны твор, з якога ўзяты гэтыя радкі. *(Максімальная колькасць балаў — 3.)*

Пад казачным дубам над Нёманам сінім
хлапец прызнаваўся ў каханні дзяўчыне.
І рэхам той шэпт адгукаўся між гаю:
— Кахаю... кахаю... кахаю... кахаю...
Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае,
маё, беларускае, роднае, кроўнае...
такое сваё і такое чароўнае...

| Аўтар твора | Назва твора | Вершаваны памер твора |
|---|---|---|
| | | |

## Даведкі

### Заданне 1

| Словазлучэнні на рускай мове | Адпаведнікі словазлучэнняў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) устная *речь* | вуснае маўленне |
| 2) части *речи* | часціны мовы |
| 3) у него непонятная *речь* | у яго невыразнае (незразумелае) маўленне |
| прямая (косвенная) *речь* | простая (ускосная) мова |
| 5) завести *речь* о... | пачаць размову пра... |

### Заданне 2

1) Штосьці, <u>карэнчык</u> (карэ***нь***чык), <u>нянчычь</u> (ня***нь***чыць), паштальён, людзьмі;

2) <u>канцэлярыя</u> (канц***ы***лярыя), бухгалтар, адрас, <u>арэндаваць</u> (ар***а***ндаваць), крывавы;

3) штотыднёвы, <u>вогняустойлівы</u> (вогн***еў***стойлівы), <u>землятрасенне</u> (земл***е***трасенне), своечасовы, збожжаўборка.

### Заданне 3

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1) браць | бяры | бярыце |
| 2) мыць | мый | мыйце |
| 3) звузіць | звузь | звузьце |
| 4) зрэзаць | зрэж | зрэжце |

### Заданне 4

| Назоўнік | Лексічнае значэнне для канчатка *-а* | Лексічнае значэнне для канчатка *-у* |
|---|---|---|
| 1) народ *(-а/-у)* | народа *(этнас)* | народу *(натоўп, людзі)* |
| 2) пейзаж *(-а/-у)* | пейзажа *(жанр жывапісу)* | пейзажу (мясцовасць, краявід) |
| 3) пераход *(-а/-у)* | перахода *(месца на праезнай часціцы)* | пераходу (працэс, дзеянне ад дзеяслова пераходзіць) |

### Заданне 5

| Літаратурная форма жаночага імя | Размоўная форма жаночага імя |
|---|---|
| 1) Е[ф]расіння | *разм.* ***Прося***; *грэк.* — родная |
| 2) Мар[ф]а | *разм.* ***Мархва***; з *арамейскі.* — гаспадыня, настаўніца |
| 3) Со[ф']ія | *разм.* ***Сахвея***; *грэч.* — мудрая |
| 4) [Ф']ядора | *разм.* ***Хвядора, Хадора, Тадора***; *грэч.* — божы дар |
| 5) [Ф']ядосся | *разм.* ***Хвядося, Хадося, Тадося***; *грэч.* — Богам даная |

**Заданне 6**. <u>Да-вяр-а-ц-ца</u>, <u>да-дум-ва-ць</u>, <u>да-і-ць</u>, да-кор (правільна ***дакор)***, дакуль (правільна ***да-куль)***, <u>дакук-а</u>, далё-к-і (правільна ***дал-ёк-і)***, дал-і-н-а (правільна ***дал-ін-а)***, дал-онь (правільна ***далонь***), <u>дал-оў</u>.

### Заданне 7

| Прыказка |
|---|
| 1) Не капай другому яму, сам у яе ўвалішся. |
| 2) Не пазналі сваіх нашы, бярозавай далі кашы. |
| 3) Што пасееш, тое і пажнеш. |
| 4) Няма нічога тайнага (патайнага), каб не стала (што не стала б, каб не было) яўным. |
| 5) Бойся Усявышняга і не гавары лішняга. |

**Заданне 8.** 1) З каханай дзяўчынай (з Алесяй). 2) «Хмарка». 3) «Вечар». 4) «Юдзіф».

**Заданне 9:** 1-д, 2-е, 3-в, 4-г, 5-а, 6-б, 7-ж.

**Заданне 10**

| Аўтар твора | Назва твора | Вершаваны памер твора |
|---|---|---|
| Д. Бічэль | «Роднае слова» | Амфібрахій |

**Водгук на мастацкі твор**

* * *

Чым вякам ты пахвалішся,
У вяках чым праславішся,
Час маторны і мутарны,
Электронны, камп'ютарны?
Мастакамі,
Паэтамі,
Светлай доляй людскою?
Можа, толькі ракетамі,
Што вісяць над табою?

Можа, сонцам прыручаным,
Каб — ні смерчаў, ні сцюжы?
Акіянам атручаным,
Амярцвеласцю сушы?

У раз'ятраным гудзе і брудзе,
Чуеш, час што адказвае нам:
— Чым мяне вы загрузіце, людзі,
Я дарэшты вякам перадам!

*Анатоль Грачанікаў.*

**X клас**

**Заданне 1.** Перакладзіце на беларускую мову сказы з рускім словам «нет». *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| Сказы на рускай мове | Адпаведнікі сказаў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) *Нет* уверенности в том, что... | |
| 2) *Нет* чтобы поднести тяжёлую сумку! | |
| 3) В магазине *нет* этого диска. | |
| 4) *Нет*, вы только подумайте! | |
| 5) Её всё *нет* и *нет*. | |

**Заданне 2.** Падкрэсліце ў кожным радзе слова(ы) з арфаграфічнымі памылкамі. *(Максімальная колькасць балаў — 6.)*

1) Ін'екцыя, ад'ютант, двух'ярусны, каньюнктура, Вьетнам;

2) спецыяльнасць, асацыацыя, аўкцыён, бібліёграф, біятлон;

3) радыяграма, саракагоддзе, вогняўстойлівы, землеўласнік, лёгкадумны.

**Заданне 3.** Пастаўце дзеясловы ў форме загаднага ладу адзіночнага і множнага ліку. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

**Узор:** спаць — спі, спіце.

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1) адмераць | | |
| 2) біць | | |
| 3) закасаць | | |
| 4) спяваць | | |
| 5) рэзаць | | |

**Заданне 4.** Перакладзіце фрагмент з пасляслоўя Францыска Скарыны да кнігі «Эсфір» на сучасную беларускую мову. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

Доконана ест книга Есфер, Божией помощию и его пречистое матери Марии к научению людем посполитым рускаго языка. Выложена працею и вытиснена повелением ученаго мужа Франциска Скорины из славнаго града Полоцька, в науках и в лекарстве учителя, у великом месте Празском по летех нарожения нашего спасителя господа Ісуса Христа тысещи пятистех и девятинадесять.

**Заданне 5.** Падкрэсліце словы, у якіх адсутнічае прыстаўка. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

Акоп, акругласць, акруга, акунь, алей, апаліць, апалонік, аплата, апоўдні, апорт.

**Заданне 6.** Растлумачце значэнне слова-злучэнняў. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| Словазлучэнне | Значэнне |
|---|---|
| 1) *чорнае* золата | |
| 2) у *чорным* целе | |
| 3) *чорны* дзень | |
| 4) *чорная* костка | |
| 5) *чорным* па белым | |

**Заданне 7.** З галоўнай часткай *Прыйдзе вясна* складзіце і запішыце складаназалежныя сказы са значэннем прычыны, мэты, умовы, уступкі, параўнання. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| Сказ | Значэнне |
|---|---|
| Прыйдзе вясна, ______ | прычыны |
| ______ | мэты |
| ______ | умовы |
| ______ | уступкі |
| ______ | параўнання |

**Заданне 8.** Адкажыце на пытанні віктарыны. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

1. Па прапанаваным урыўку вызначце, слоўны партрэт якога беларускага пісьменніка

**стварыў У. Караткевіч у рамане «Каласы пад сярпом тваім».**

На краёчку канапы, у кутку, сядзеў, зручна ўціснуўшыся ў мяккую падушку, нібы патануўшы ў ёй круглаватай фігуркай, маленькі дабрадушны гарбун. Горб у яго быў невялічкі і нагадваў бы лёгкую сутуласць, калі б толькі правае пляча не было вышэй за левае... На круглым мяккім абліччы блукала ўсёдаравальная, расчуленая ўсмешка. Гарбуну было год сорак пяць, але праставатыя блакітныя вочы, светла-русыя валасы, у якіх цяжка было заўважыць сівізну, румяны ўсмешлівы рот надавалі ягонаму абліччу добры, наіўны, у нечым дзяціны выраз. Зірнуўшы на яго, нельга было не сказаць: «Ах, які добры чалавек!»

АДКАЗ: ______________________

**2. Які знакаміты верш Янкі Купалы перакладзены на 83 мовы свету?**

АДКАЗ: ______________________

**3. Пра каго гаворыць гераіня паэмы «Хамуціус» А. Куляшова?**

Дзівак. А сам ты пад мянушкай Світкі
Не вандраваў? А Яська-гаспадар,
Хамовіч, Макарэвіч, камісар
Чарноцкі — хто?

АДКАЗ: ______________________

**4. Каму з герояў «Пінскай шляхты» В. Дуніна-Марцінкевіча належаць наступныя словы: «Вы думаеце, што мне міла паняверыць кроў шляхецкую? Я ж сам шляхціц, вам родны, але што рабіць?»**

АДКАЗ: ______________________

**Заданне 9.** Каму з пералічаных герояў «Раскіданага гнязда» Янкі Купалы належаць наступныя словы? Суаднясіце прыведзеныя выказванні з адпаведнымі персанажамі. Адказ запішыце ў форме спалучэння «лічба-літара» (напрыклад: 6-е). *(Максімальная колькасць балаў — 7.)*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | «Бацькі і дзяды жылі на гэтым куску зямелькі. Вечна думалі жыць». | а. Марыля |
| 2. | «Гэта вечная пакута толькі чалавека на звера перарабляе... Я сам сябе не пазнаю». | б. Сымон |
| 3. | «Хто ведае — можа, ты горай сваёй гордасцю топчаш тое, што сею я сваім сэрцам?..» | в. Старац |
| 4. | «Склікаецца сход вялікі, і ўсе браты і сёстры павінны на гэты сход з'явіцца». | г. Незнаёмы |
| 5. | «Заўсёды бяда бяду вядзе, але ніколі не трэба здавацца». | д. Зоська |
| 6. | «Божа ты наш справядлівы, за якія грахі цяжкія караеш ты нашу сямейку!» | е. Лявон |
| 7. | «Чакай, баба, Пятра — будзеш сыр есці! Яму ў галаве ўсё дагары нагамі перавярнулася, а мы слухаць мусім і чакаць нейкае злыбеды...». | ж. Данілка |

АДКАЗ: ______________________

**Заданне 10.** Вызначце вершаваны памер прыведзеных ніжэй радкоў. Назавіце аўтара і літаратурны твор, з якога ўзяты гэтыя радкі. *(Максімальная колькасць балаў — 3.)*

Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.

| Аўтар твора | Назва твора | Вершаваны памер твора |
|---|---|---|
| | | |

## Даведкі

### Заданне 1

| Сказы на рускай мове | Адпаведнікі сказаў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) *Нет* уверенности в том, что... | 1) *Няма* ўпэўненасці (перакананння) у тым, што... |
| 2) *Нет* чтобы поднести тяжёлую сумку! | 2) *Не* каб паднесці цяжкую сумку! |
| 3) В магазине *нет* этого диска. | 3) У магазіне *няма* гэтага дыска (адсутнічае гэты дыск). |
| 4) *Нет*, вы только подумайте! | 4) *Не*, вы толькі падумайце! |
| 5) Её всё *нет* и *нет*. | 5) Яе ўсё *няма* і *няма*. |

### Заданне 2

1) ін'екцыя, ад'ютант, двух'ярусны, каньюнктура (кан'юнктура), Вьетнам (В'етнам);

2) спецыяльнасць, асацыацыя (асац**ыя**цыя), аўкцыён, бібліёграф, біятлон;

3) радыяграма (рад**ыё**грама), саракагоддзе, вогняўстойлівы (вогн**е**ўстойлівы), землеўласнік, лёгкадумны (л**е**гкадумны).

### Заданне 3

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1) адмераць | *адмерай* | *адмерайце* |
| 2) біць | *бі* | *біце* |
| 3) закасаць | *закашы* | *закашыце* |
| 4) спяваць | *спявай* | *спявайце* |
| 5) рэзаць | *рэж* | *рэжце* |

**Заданне 4** *(прыкладны варыянт перакладу)*. Скончана кніга Эсфір, з Божай дапамогай і яго прачыстай Маці для навучання людзей простых (звычайных) рускай мовы (якія гавораць рускай /старажытнарускай мовай). Выкладзена і выціснена па жаданні вучонага мужа Францыска Скарыны са слаўнага горада Полацка, у навуках і ў лекарстве настаўніка, у вялікім горадзе Празе ў 1519 годзе ад нараджэння збавіцеля /спаса / нашага Ісуса Хрыста.

**Каментарый.** Пры перакладзе неабходна захаваць рысы і пафас канфесійнага стылю.

**Заданне 5.** А-коп, а-кругласць, акруга, акунь, алей, а-паліць, апалонік, а-плата, а-поўдні, апорт.

### Заданне 6

| Словазлучэнне | Значэнне |
|---|---|
| 1) *чорнае* золата | нафта |
| 2) [трымаць] у *чорным* целе | а) надгаладзь, без дастатковага харчавання; б) вельмі строга, сурова, абмяжоўваючы свабоду дзеянняў |
| 3) *чорны* дзень | цяжкі, змрочны час для каго-небудзь |
| 4) *чорная* костка | чалавек простага, нязнатнага (нізкага) паходжання |
| 5) [напісана, надрукавана] *чорным* па белым | вельмі дакладна, выразна, зусім пэўна, недвухсэнсава |

### Заданне 7

| Сказ | | Значэнне |
|---|---|---|
| Прыйдзе вясна, | бо зямля чакае аднаўлення. | прычыны |
| | каб апрануць усе дрэвы ў далікатнае лісце. | мэты |
| | калі не затрымаюць яе зімовыя вятры. | умовы |
| | хоць злы мароз і шчыпле вушы. | уступкі |
| | нібы першае каханне ў нашае жыццё — раптоўна і нечакана. | параўнання |

**Заданне 8.** 1) В. Дунін-Марцінкевіч. 2) «А хто там ідзе?». 3) Пра Кастуся Каліноўскага. 4) Кручкову.

**Заданне 9:** 1-е, 2-б, 3-д, 4-г, 5-в, 6-а, 7-ж.

### Заданне 10

| Аўтар твора | Назва твора | Вершаваны памер твора |
|---|---|---|
| Янка Купала | «Мая малітва» | Амфібрахій |

### Водгук на мастацкі твор

**ЧАЛАВЕК**

Касматы,
першабытны,
нізкалобы,
яшчэ не чалавек,
упершыню
ён аглядзеў —
загадкавая спроба —
дрымучымі вачамі вышыню.
Яна цякла,
палала,
зіхацела,
уздрыгвала агеньчыкамі зор.
Ён разагнуўся мускулістым целам,
узняўся і —
уражаны —
замёр:
працяты невядомым запаветам,
апалены
высокай сінявой,
нібы Атлант, —
нагамі у планету
і ў нерухомы купал —
галавой.

*Алесь Разанаў. 1966 г.*

## XI клас

**Заданне 1.** Перакладзіце на беларускую мову сказы з рускім словам «нет». *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| Сказы на рускай мове | Адпаведнікі сказаў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) У меня *нет* возможности. | |
| 2) Этого не было, *нет* и не будет. | |
| 3) Ты уже прочитал статью или *нет*? | |
| 4) Свести на *нет*. | |
| 5) Я ему напоминал дважды, так *нет*, всё мало. | |

**Заданне 2.** Падкрэсліце ў кожным радзе слова(ы) з арфаграфічнымі памылкамі. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

1) Шмат'ядзерны, інтэрвью, ад'ютант, Вікенцьеў, парцье;

2) кратэр, гардэроб, рэвізія, экватэр, рысора;

3) боепрыпасы, мёдаварэнне, Велікабрытанія, сямікласнік, радыястанцыя.

**Заданне 3.** Пастаўце дзеясловы ў форме загаднага ладу адзіночнага і множнага ліку. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

**Узор:** спаць — спі, спіце.

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1) нарэзаць | | |
| 2) піць | | |
| 3) усаджвацца | | |
| 4) уваходзіць | | |
| 5) наліваць | | |

**Заданне 4.** Перакладзіце фрагмент з прадмовы Францыска Скарыны да кнігі «Другі Закон» на сучасную беларускую мову. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

Кажный человек, имея розум, познаеть, иже непослушание, убивство, ненависть, несправедливость, неволя, гордость, злоречение, клеветание, зависть и иная тым подобная злая быти, понеже сам таковых речей от иных не хощеть терпети. А тако прежде всех законов или прав писаных закон приroженый всем людем от Господа Бога дан ест и весь во едином словеси скончеваеться: «Возлюбиши ближнего своего, яко сам себе».

**Заданне 5.** Запоўніце табліцу. Абазначце словаўтваральныя сродкі, укажыце спосаб утварэння новага слова. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

**Узор:** вучань → вучн-*еўск*-і (суфіксальны).

| Утваральнае слова | Вытворнае (утворанае) слова | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| 1) | здзяйсненне | |
| 2) | квашаны *(прыметнік)* | |
| 3) | лісце | |
| 4) | лесаахоўны | |
| 5) | наблытаць | |

**Заданне 6.** Паходжанне многіх беларускіх прозвішчаў дастаткова матываванае. Прааналізуйце і запішыце, чым займаліся «першыя» ўладальнікі прыведзеных прозвішчаў. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| Прозвішча | Род заняткаў, прафесія |
|---|---|
| 1) Асмалоўскі | |
| 2) Алейнік | |
| 3) Бортнік | |
| 4) Войт | |
| 5) Кашэль (Кошаль, Кашалевіч, Кашальчук) | |

**Заданне 7.** Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце і запішыце тып складанага сказа. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

Ад балот патыхала нейкім невыразным смуткам ціхім жалем веяла ад аднатонных малюнкаў палескіх куткоў дзе ўсё ж такі жыццё стварала своеасаблівыя формы і нягледзячы на ўбоства мела сваю пава́бнасць і хараство свой твар поўны тужлівага задумення *(Якуб Колас)*.

ТЫП СКЛАДАНАГА СКАЗА: ______________

______________________________

**Заданне 8.** Адкажыце на пытанні віктарыны. (*Максімальная колькасць балаў — 4.*)

1. На стварэнне якога верша натхніла паэта П. Броўку руская народная песня «На Муромской дарожке стояли три сосны...»?

АДКАЗ: ______________

2. Гэта герой народнага падання, гэта герой паэмы Янкі Купалы, яго імя адкрыла чытачу У. Караткевіча. Назавіце яго.

АДКАЗ: ______________

3. Гэта кніга духоўнай паэзіі Р. Барадуліна ў 2006 г. была вылучана ксяндзом Уладзіславам Завальнюком на атрыманне Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры.

АДКАЗ: ______________

4. Хто з герояў рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні» заслужыў такі папрок: «Дрыжэў за сваю скуру... Дрыжэў, як апошні баязлівец. Страціць партызанскую славу, кар'еру — вось чаго ты баяўся!» (?)

АДКАЗ: ______________

**Заданне 9.** Каму з пералічаных герояў п'есы «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы належаць наступныя словы? Суаднясіце прыведзеныя выказванні з адпаведнымі персанажамі. Адказ запішыце ў форме спалучэння «лічба-літара» (напрыклад: 6-е). *(Максімальная колькасць балаў — 8.)*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | «Учора лёг спаць як чэсны савецкі грамадзянін, а сягоння ўстаў, бачу — нешта няладнае. Некаторыя знаёмыя не пазнаюць мяне, на другі бок вуліцы пераходзяць, калі сустрэнуцца». | а. Гарлахвацкі |
| 2. | «Я так і думаў! Не можа быць, каб вы... такую бязглуздзіцу напісалі». | б. Зёлкін |
| 3. | «Новы поп, дык новае і маленне. У таго дырэктара, бывала, адзін столік, два крэслы, і ўсё. А ў гэтага ж стол гэтакі, а на стале ж мартаплясаў усялякіх панастаўляна...». | в. Туляга |
| 4. | «Няхай жа ведаюць усе свінні — мамантавыя і немамантавыя: калі каторая з іх паспрабуе пакасціць у нашай навуцы, будзем біць проста па пятачку». | г. Чарнавус |
| 5. | «Гэта ж узяць тую звычайную костку, што пад нагамі валяецца, паглядзець на яе і ўгадаць, якія свінні былі мільёны год назад!» | д. Леванові́ч |
| 6. | «Лепш бы я памёр на той час, калі будзе чытацца гэты даклад». | е. Вера |
| 7. | «Працаваць трэба заўзята. Вось як я, напрыклад, — адпачыць хвіліну часу няма». | ж. Нічыпар |
| 8. | «Па-мойму — ты не з таго канца пачаў разбірацца. Трэба пацікавіцца, адкуль ідуць гэтыя плёткі». | з. Цёця Каця |

АДКАЗ: ______________________________

**Заданне 10.** Вызначце вершаваны памер прыведзеных ніжэй радкоў. Назавіце аўтара і літаратурны твор, з якога ўзяты гэтыя радкі. *(Максімальная колькасць балаў — 3.)*

Між алешын, кустоў,
Дзе пяе салавей,
І шуміць, і грыміць
Срэбразвонны ручэй.

| Аўтар твора | Назва твора | Вершаваны памер твора |
|---|---|---|
| | | |

## Даведкі

### Заданне 1

| Сказы на рускай мове | Адпаведнікі сказаў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) У меня *нет* возможности. | 1) У мяне *няма* магчымасці (Я *не маю* магчымасці). |
| 2) Этого не было, *нет* и не будет. | 2) Гэтага не было, *няма* і не будзе. |
| 3) Ты уже прочитал статью или *нет*? | 3) Ты ўжо прачытаў артыкул ці *не*? |
| 4) Свести на *нет*. | 4) Звесці на *нішто*. |
| 5) Я ему напоминал дважды, так *нет*, всё мало. | 5) Я яму нагадваў двойчы, дык *не*, усё мала. |

### Заданне 2

1) Шмат'ядзерны, <u>інтэрвью</u> (інтэрв'ю), ад'ютант, Вікенцьеў, парцье;

2) <u>кратэр</u> (крат**а**р), гардэроб, рэвізія, <u>экватэр</u> (экват**а**р), рысора;

3) боепрыпасы, мёдаварэнне, <u>Велікабрытанія</u> (В**я**лікабрытанія), сямікласнік, <u>радыястанцыя</u> (рад**ыё**станцыя).

### Заданне 3

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1) нарэзаць | *нарэж* | *нарэжце* |
| 2) піць | *пі* | *піце* |
| 3) усаджвацца | *усаджвайся* | *усаджвайцеся* |
| 4) уваходзіць | *уваходзь* | *уваходзьце* |
| 5) наліваць | *налі* | *наліце* |

### Заданне 4

**Заданне 4** *(прыкладны варыянт перакладу)*. Кожны чалавек, маючы розум, спазнае, якім злом з'яўляюцца непаслушэнства, забойства, нянавісць, несправядлівасць, злы намер, няволя, ганарыстасць, грубіянства (нядобрыя словы), паклёпніцтва, зайздрасць і іншыя падобныя рэчы / з'явы, паколькі сам такія рэчы ад іншых не жадае цярпець. А таму раней за ўсе законы і пісанае права Бог даў усім людзям права, сутнасць якога ў адзіным сказе выказана: «Шануй бліжняга свайго, як сам сябе».

**Каментарый.** Пры перакладзе неабходна захаваць рысы і пафас канфесійнага стылю.

### Заданне 5

| Утваральнае слова | Вытворнае (утворанае) слова | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| 1) здзейсн/і/-(ць) | здзяйсн-енн-[е] | суфіксальны |
| 2) квашан-[ы] *(дзеяслоў у форме дзеепрыметніка)* | квашан-[ы] *(прыметнік)* | марфолага-сінтаксічны (пераход з адной часціны мовы ў другую) |
| 3) ліст-[ы] | лісц-Ø -[е] | нулявая суфіксацыя |
| 4) ахоў/ва/-(ць) лес-□ | лес-а-ахоў-н-[ы] | асновасклад. + суф. |
| 5) блыта-(ць) | на-блыта-(ць) | прыставачны |

### Заданне 6

| Прозвішча | Род заняткаў, прафесія |
|---|---|
| 1) Асмалоўскі | Каб бервяно не гніло, калі яго кладуць на зямлю або ўкопваюць у яе, ставячы слупы, або забіваюць як палю, спачатку яго асмольваюць ці абвугліваюць. Гэтым і займаўся Асмалоўскі. |
| 2) Алейнік | Прозвішча такое давалі таму чалавеку, які гнаў алей з ільнянога ці канаплянага семя. |
| 3) Бортнік | У даўнія часы пчол разводзілі не каля дому, а ў лесе. Вуллі рабілі ў выглядзе калоды — камля сасны з выдзеўбаным асяродкам. Або проста выдзёўбвалі дупло ў старой сасне, куды пасяляўся пчаліны рой. Такія прыстасаванні для пчол называлі *борцямі*, а людзей, якія займаліся зборам мёду з борцяў, — *бортнікамі*. Так узнікла прозвішча *Бортнік*. |
| 4) Войт | Войт — старабеларуская назва старшыні гарадскога суда, начальніка воласці (гміны), прыганятага, якога прызначаў пан глядзець прыгонных сялян, каб старанна працавалі. Ад пасады, якую займаў чалавек, і ўтваралася гэтае прозвішча і яго варыянты. |
| 5) Кашэль (Кошаль, Кашалевіч, Кашальчук) | *Кош*, або *кашэль*, — плеценая з лучыны ці з лазовых або арэхавых дубцоў пасудзіна. Чалавека, які плёў такія кашалі, і называлі *Кашэль*, *Кошаль* і г. д. Яшчэ *кошалем* называлі таго чалавека, які працаваў на млыне, засыпаў у *кош* над жорнамі зерне для мліва. |

### Заданне 7

(I) Ад балот патыхала нейкім невыразным смуткам,[1] (II) ціхім жалем веяла ад аднатонных малюнкаў палескіх куткоў,[2] (III) дзе ўсё ж такі жыццё стварала своеасаблівыя формы і,[3] нягледзячы на ўбоства,[4] мела сваю павабнасць і хараство,[5] свой твар,[6] поўны тужлівага задумення (*Якуб Колас*).

ТЫП СКЛАДАНАГА СКАЗА: Складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак, або сказ камбінаванай будовы (спалучэнне бяззлучнікавай — 1 і 2 часткі — і падпарадкавальнай сувязі — 3 частка).

**Каментарый.** 0,5 бала — за кожны правільна пастаўлены знак прыпынку; 2 балы — за правільна вызначаны тып складанага сказа.

**Заданне 8.** 1) «Александрына». 2) Машэка. 3) «Ксты». 4) Гукан.

**Заданне 9:** 1-г, 2-б, 3-з, 4-д, 5-ж, 6-в, 7-а, 8-е.

### Заданне 10

| Аўтар твора | Назва твора | Вершаваны памер твора |
|---|---|---|
| Якуб Колас | «Ручэй» | Анапест |

### Водгук на мастацкі твор

#### ДАРОГА

Дарога — як рака: разгаліноўваецца на шматлікія прытокі — сцежкі і цячэ паўз двары, гарады, агароды, усё закранаючы сабою і ўсё пакідаючы па-за сабою.

Адзінага, каго яна не можа пакінуць, — гэта чалавека: калі рухаецца ён — рухаецца і яна, калі спыняецца ён — спыняецца і яна. Ён — яе другое «я», яе спадарожнік і павадыр, які дырыгуе, як ёй ісці — тапопка ці паволі, ціха ці гучна.

Усё, што здараецца з дарогай, здараецца і з чалавекам, і ўсё, што ні здараецца з чалавекам, здараецца якраз у дарозе, бо сама прырода дарогі — здарацца, «здарагацца».

Але калі адрасы дарогі вядомыя — яны акрэслены на картах і схемах, то адрас чалавека невядомы; разам яны ідуць да небакраю, датуль, дзе неба злучаецца з зямлёю, далей у памяці дарогі чалавека няма, далей чалавек ідзе сам: адною сваёю прыродай у дол, другою — угору.

Дарога адгароджана ад наваколля сваім радаводам, сваёй роляй — яны ў яе выключныя: наваколле замыкаецца ў круг, у карагод, а дарога, наадварот, выключаецца з круга, расторгвае яго. Яна ў два канцы, у два рагі, і праторана своеасаблівым нарогам — людскою хадой.

Дарога — найдаражэйшая госця: яна нясе людзям навіны, нясе дары, нясе радасць і гора, трагедыю і жарт, гатовая, як торг, заўтра змяніць іх на процілеглае.

Дарога — палімпсест, тора чалавечай гісторыі: што на ёй выдрукоўваюць адны, сціраюць, выдрукоўваючы сваё, другія.

Але так пішацца жыццяпіс чалавецтва, і нават калі дарога зарастае драсёнам, дрыжнікам ці падарожнікам — першым сведчаннем пра чалавецтва усё роўна застаецца яна, дарога, — самы вялікі супольны чалавечы твор *(Алесь Разанаў)*.

## Узоры білетаў з тэмамі да конкурсу «Вуснае выказванне»

### IX клас

**Білет 1**

1. Юнацтва маё ў непагожыя дні
   Прайшло па этапных шляхах стараны
   *(Максім Танк).*

2. Афарызмы — гэта тэрміновыя тэлеграмы розуму *(Георгій Марчук).*

**Білет 2**

1. Мова...
   У марах, у песнях, у снах
   Мае ў ёй кожнае слова
   Свой колер, і смак, і пах *(Анатоль Грачанікаў).*

2. Асветнікі зямлі беларускай.

**Білет 3**

1. Рай — калі ёсць выбар, а пекла — калі выбару няма *(Георгій Марчук).*

2. Палеткі мудрасці народаў — кнігі *(Данута Бічэль).*

**Білет 4**

1. Наш хлеб — жыцця аснова,
   Працяг і барацьба *(Пімен Панчанка).*

2. Самы родны ў свеце чалавек.

**Білет 5**

1. Чалавеку не трэба спагады, —
   Дабрата чалавеку патрэбна...
   *(Сяргей Грахоўскі).*

2. Шануй сваю мову, свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае — ...гэта вялікі нацыянальны скарб... *(Змітрок Бядуля).*

### X клас

**Білет 1**

1. Слова — радасць, слова — чары, вобраз вечна юных вёсен *(Якуб Колас).*

2. За што мы сёння ў адказе?

**Білет 2**

**1.** Ты — юнак. Навакол
Свет, як песня, прыгожы, прывабны
*(Пімен Панчанка).*

**2.** Без мінулага няма сучаснасці і будучыні.

**Білет 3**

**1.** І песню родную люблю я... *(Канстанцыя Буйло).*

**2.** І калі б была воля мая на тое — пачаў бы я азбуку менавіта з літары М: як і ўсё на зямлі, усё ў нас пачынаецца з Маці *(Рыгор Барадулін).*

**Білет 4**

**1.** Мой чароўны беларускі край, Бацькаўшчына светлая мая! *(Уладзімір Караткевіч).*

**2.** Можна знаць гісторыю, геаграфію, эканоміку Беларусі, але, толькі пазнаёміўшыся з творчасцю Купалы і Коласа, можна зразумець душу народа... *(Максім Танк).*

**Білет 5**

**1.** Старажытнай і юнай песняю
Пра Зубра прабіваецца слова *(Васіль Зуёнак).*

**2.** Полацк — калыска беларускай культуры.

### XI клас

**Білет 1**

**1.** Хай сіла ў чатыры столкі
маё скруціць карэнне —
перад Радзімай толькі
апушчуся на калені *(Данута Бічэль).*

**2.** Мы часта самі адчувалі, што адной кнігі мы не можам дачытаць, а другая чытаецца лёгка, ад яе нельга адарвацца. Усё ў ёй хораша, натуральна... І сакрэт гэтага майстэрства просты... *(Ян Скрыган).*

**Білет 2**

**1.** Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,
Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў...
*(Якуб Колас).*

**2.** Ад званка да выпускнога — адзін крок... Заўтра воля. Не, сёння воля!.. Бывай, школа! *(Георгій Марчук).*

**Білет 3**

**1.** Жыццё даецца, каб жыццё тварыць... *(Анатоль Вярцінскі).*

**2.** Сэрцу чалавечаму песня дае ўцеху, а дзеткам, якія слухаюць яе, — жывую навуку *(Цётка).*

**Білет 4**

**1.** Калі цябе вабіць жанчына — ты пішаш верш.
Калі цябе чаруе чалавек — ты пішаш раман.
Калі цябе вярэдзіць быццё — ты пішаш эсэ
*(Валянцін Акудовіч).*

**2.** Не шукай ты шчасця, долі
На чужым далёкім полі *(Янка Купала).*

**Білет 5**

**1.** Незабыўнае імя Маці — як гаючы глыток жыцця... *(Мікола Федзюковіч).*

**2.** Можна знаць гісторыю, геаграфію, эканоміку Беларусі, але, толькі пазнаёміўшыся з творчасцю Купалы і Коласа, можна зразумець душу народа... *(Максім Танк).*

*Падрыхтавалі* ***В. У. Праскаловіч, А. А. Радзевіч, І. І. Савіцкая***

## Да ведама аўтараў і падпісчыкаў

Рэдакцыя прымае да разгляду матэрыялы на беларускай мове аб'ёмам да 20 машынапісных старонак у 2 экзэмплярах (пажадана з наборам на электронным носьбіце, можна дасылаць электроннай поштай).

Артыкулы павінны быць надрукаваны на белай паперы праз 2 інтэрвалы на адным баку ліста (фармат А4, тэксты, набраныя на камп'ютары, — кегль 12).

Неабходна ўказаць прозвішча, імя і імя па бацьку аўтара, месца яго працы, займаемую пасаду, вучоную ступень, вучонае званне, хатні адрас, тэлефоны, пашпартныя звесткі (серыя, нумар пашпарта, калі і кім выдадзены, асабісты нумар, адрас рэгістрацыі). Без гэтых звестак матэрыялы разглядацца не будуць.

Дасылаючы ў часопіс распрацоўкі ўрокаў, абавязкова пазначайце клас, чвэрць і месяц, калі тэма вывучаецца ў школе.

Рукапісы аўтарам не вяртаюцца.